Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (157), 2026

УДК 94(476)+37(476)(091) EDN: FPUZWU

# Гістарычная трансляцыя сацыяльна значнага досведу на тэрыторыі Беларусі (да канца X ст. н. э.) і яе адпаведнасць агульнаеўрапейскай практыцы (Частка 1)

В.А. Пілецкі

Праведзена даследаванне гістарычнай трансляцыі міжпакаленнага сацыяльна значнага досведу на тэрыторыі Беларусі (ад старажытнасці да канца X ст.) і яе адпаведнасці агульнаеўрапейскай практыцы.
**Ключавыя словы:** міжпакаленны сацыяльна значны досвед, гістарычная трансляцыя досведу, ініцыяцыі, выхаваўча-адукацыйны працэс, перадыніцыяцыйная падрыхтоўка, «лясныя дамы», першабытнасць, родавая абшчына.

A study was conducted on the historical transmission of intergenerational socially significant experience on the territory of Belarus (from antiquity to the end of the 10th century) and its compliance with pan-European practice.
**Keywords:** intergenerational socially significant experience, historical transmission of experience, initiations, educational process, pre-initiation preparation, «forest houses», primitiveness, tribal community.

**Уводзіны.** Сацыяльна значны досвед і яго перадача (гістарычная трансляцыя) новым пакаленням грамадзян – адзін з важнейшых механізмаў (матыватараў) грамадскага прагрэсу. Прагрэсіўная эвалюцыя чалавечай гісторыі, адпаведна дзеючым навуковым дадзеным (тэорыі Ч. Дарвіна, генетыкі XX ст. і сучаснай «сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі» [1, с. 293–312]), прайшла ў сваім развіцці глабальны шлях. Ад прасцейшых (паўжывёльных, інстынктыўна-рэфлекторных) спосабаў жыцця першабытнага чалавечага статку (і раннеродавай абшчыны), заснаваных на збіральніцкай дзейнасці, загонным паляванні і рыбалоўстве, да сучасных высока-тэхналагічных відаў дзейнасці (з улікам робататэхнікі, нанатэхналогій, камп'ютарнай і касмічнай тэхнікі, выкарыстання штучнага інтэлекту ў розных сферах (медыцыне, гуманітарных навуках, сродках масавай інфармацыі і інш.).

Усё гэта, найперш, з'яўляецца вынікам накаплення сацыяльна значнага досведу і яго перадачы (гістарычнай трансляцыі) новым пакаленням грамадзян. Міжпакаленны досвед – гэта цэнтральны асноватворны (істотны) элемент у гістарычнай эвалюцыі любога грамадства. Ён не з'яўляецца статычным, а знаходзіцца ў пастаянным дыялектычным (прагрэсіўна-рухомым) стане. Вынаходніцтва, замацавання ў грамадскай свядомасці і перадача новым пакаленням найбольш аптымальных спосабаў арганізацыі жыццядзейнасці. Якія дапаўняюць і ўдасканальваюць яго, а потым перадаюць сваім нашчадкам. Дзякуючы наяўнасці такога важнага працэсу чалавецтва змагло вытрымаць змаганне з непазнаным (нават варожым некалі) прыродным асяроддзем і дзікім жывёльным светам. Што дазволіла яму захавацца ў гісторыі ў якасці асобнай сацыяльнай адзінкі і дабіцца прагрэсіўнай эвалюцыі свайго жыцця.

Цікава, што ўсё гэта адбывалася і на беларускіх землях. Прычым меліся тут як агульнасусветныя працэсы, так і мясцовыя, абумоўленыя спецыфікай геаграфічных, геапалітычных, эканамічных, сацыяльна-культурных, рэлігійна-ідэалагічных абставін. Дзе змяняліся храналагічныя межы асобных істотных этапаў. З'яўляліся мясцовыя традыцыі ажыццяўлення тых ці іншых працэсаў, пацверджаныя этнаграфічнымі матэрыяламі, вуснай народнай творчасцю альбо археалогіяй. Усё гэта падлягае навуковаму даследаванню, высвятленню і абгрунтаванню.

Актуальнасць вывучэння праблемы гістарычнай трансляцыі міжпакаленнага сацыяльна значнага досведу на тэрыторыі Беларусі (ад старажытнасці да канца X ст.) і яе адпаведнасці агульнаеўрапейскай практыцы абумоўлена неабходнасцю паглыблення навуковага асвятлення гісторыі насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў старажытнасці. Найперш у якасці своеасаблівых вытокаў сучаснага соцыякультурнага становішча. Вызначэння сапраўднага месца жыхароў

нашай краіны сярод суседніх народаў. Для павелічэння сумарнага аўтарытэту айчыннай гісторыі. Патрэбнага для выхавання сучаснага грамадства. Адстойвання суверэнітэту Беларусі (з улікам абвастрэння міжнародных адносін) і іншых сацыяльна значных мэтаў.

Гістарыяграфія. Мы ўжо неаднаразова звярталіся да асобных аспектаў названай праблематыкі не толькі ў выглядзе навуковых артыкулаў [2, с. 9–14], [3, с. 3–12.], але і манаграфій [4], [5]. Але казаць пра канчатковае вывучэнне дадзенага кірунку яшчэ пакуль рана. Нельга таксама заявіць і аб тым, што тэма зусім не разгледжана ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Па тых ці іншых аспектах дадзенай праблематыкі маецца даволі значная колькасць важкіх гістарычных даследаванняў, якія высвятляюць яе рознабаковыя адценні.

Жадаючым паглыбіцца ў гэтую навуковую праблему можна параіць шэраг прац айчынных і замежных даследчыкаў, якія так ці інакш раскрываюць сферу падрыхтоўкі моладзі ў розных першабытных соцыумах (Г.Б. Карнетаў [6], [7], Э. Хорватова [8, с. 162–173], М.О. Косвен [9], Л.А. Файнберг [10], [11, с. 367–369], М.В. Станюкович [12, с. 205–231], Мірча Эліадэ [13] і многія іншыя. Сярод іх, напрыклад, такія ўнікальныя даследаванні, як вывучэнне этнаграфічнага феномена Бабы-Ягі пры рэканструкцыі жаночых полава-узроставых ініцыяцыяй усходнеславянскага рэгіёна нямецкай даследчыцы Рыхарды Бекер [14] і інш.).

Разам з тым аналіз названых працэсаў адносна асобных мясцовасцей, і тым больш у дачыненні да беларускіх зямель, у навуковай прасторы яшчэ адсунічае. А таксама з пункту гледжання кампаратыўнага падыходу з улікам розных тэрытарыяльных арэалаў. Таму дадзенае даследаванне ў названай фармулёўцы (з параўнальным аспектам), на наш погляд, мае дастатковы ўзровень навізны і будзе запатрабавана навуковай грамадскасцю нашай краіны.

**Асноўная частка.** Дзейнасць па выхаваўча-адукацыйнай падрыхтоўцы моладзі (альбо: гістарычнай трансляцыі міжпакаленнага сацыяльна значнага досведу) у якасці асобнай сферы жыцця грамадства існуе ад найстаражытнейшых часоў да сучаснасці і адыгрывае важную ролю ў станаўленні чалавецтва. Яна адбываецца ў гісторыі любых грамадстваў і на любых этапах іх гістарычнага развіцця як у старажытнасці, так і ў сучаснасці. Доказам яе наяўнасці з’яўляецца гістарычны прагрэс грамадства. Дзе кожнае новае пакаленне (што засвоіла досвед папярэднікаў і дадало свае дасягненні) заўсёды валодае большай колькасцю дасканалых тэхналогій у параўнанні з ранейшым перыядам. Іх досвед, заўсёды «*…склада[-ецца] з ведаў усіх папярэдніх пакаленняў…*» [15, с. 162] і таму мае больш высокі ўзровень. У працэсе трансляцыі грамадскага досведу на розных стадыях гістарычнай эвалюцыі адрозніваюцца толькі формы яе ажыццяўлення і змест грамадскіх ведаў, навыкаў, эканамічна-здабытковых, ідэалагічных, культурных каштоўнасцяў, неабходных для засваення новымі пакаленнямі.

Паўсямеснасць выкарыстання практыкі перадачы досведу ў любых грамадствах, аднак, не азначае аднолькавасці яе эвалюцыі. Гістарычны шлях кожнага асобнага соцыума, безумоўна, унікальны. Яго «дарожная карта» ў галіне выхавання і адукацыі залежыць ад мноства фактараў, у тым ліку прыродных, кліматычных, геаграфічных, палітычных. А таксама ад спецыфікі эканамічнай, сацыяльна-палітычнай і рэлігійна-ідэалагічнай эвалюцыі.

Спроба параўнання гістарычнай трансляцыі міжпакаленнага сацыяльна значнага досведу на тэрыторыі Беларусі з агульнаеўрапейскай практыкай выяўляе, найперш, храналагічную неадпаведнасць. Калі ў гісторыі Заходнееўрапейскага арэалу акрамя першабытнасці быў перыяд антычнасці і Сярэднявечча, мяжой паміж якімі лічыцца прыблізна сярэдзіна V ст. н. э. (дакладней 476 г., год звяржэння апошняга імператара Заходняй Рымскай імперыі Ромула Аўгуста), то ў гісторыі беларускіх зямель прыблізна ў той жа перыяд (ад пачатаку–сярэдзіны І тыс. да н.э. – да V–IX стст. н. э.) разгортвалася яшчэ фінальная стадыя першабытна-абшчыннага ладу. Якая закончылася разлажэннем родавых адносін, славянізацыяй рэгіёна і пачаткам фарміравання дзяржаўнасці. Аб чым маюцца шматлікія дадзеныя археалагічных крыніц [16, с. 163–177].

Выхаваўча-адукацыйная падрыхтоўка моладзі тут (ажно да канца X ст. н. э.) працягвалася па традыцыйна-гістарычных канонах узростава-ініцыяцыйнай абраднасці. Асновы якіх сфарміраваліся ў глыбокай старажытнасці. Прыблізна ў час станаўлення раннеабшчыннага ладу, калі чалавецтва ўсвядоміла ўзроставыя асаблівасці сваіх

суграмадзян. Інакш, ажно тады, калі адбыўся падзел на т.зв. «узроставыя класы» [17], [18, с. 126–129]. З тых часоў першабытныя людзі пачалі (так ці інакш) арганізоўваць быт малалетніх суграмадзян (дакладней асоб падлеткавага ўзросту). Тых, будучых дарослых, правадказных прадстаўнікоў абшчыннай супольнасці, на якіх праз некаторы час павінна была ўскладвацца адказнасць за выжыванне ўсяго першабытнага калетыву.

Змены ў падрыхтоўцы моладзі адбыліся толькі ў канцы X ст. н. э. Ззвязаны яны былі з прыходам хрысціянства на тэрыторыю Усходняй Еўропы. Разам з хрысціянізацыяй насельніцтва беларускіх зямель тут з'явілася новая (хрысціянская) форма падрыхтоўкі. У летапісных крыніцах, як мы ўжо заўважалі аднойчы, яна атрымала назву «вучэнне кніжнае» [19, с. 53]. Гэта былі ўсходнехрысціянскія (візантыйска-праваслаўныя) рэлігійна-ідэалагічныя школьна-палітычныя ўстановы. Важнейшай мэтай, якая ўскладвалася на іх царквой, была катэхізацыя (распаўсюджванне царкоўна-хрысціянскай дактрыны) у асяроддзі мясцовага насельніцтва. Такім чынам на беларускіх землях пачаў ажыццяўляцца пераход да сярэдневяковага тыпу выхаваўча-адукацыйнага працэсу.

Інакш, Заходняя Еўропа за гэты перыяд перажыла не толькі працэс разлажэння першабытных адносін і фарміравання рабаўладальніцкага грамадства, але стварыла антычную культуру, у якой былі зародкі розных накірункаў прагрэсу. На стадыі пераходу ад антычнасці да Сярэднявечча еўрапейскае грамадства ўжо валодала значнымі дасягненнямі антычнай культуры. Шматлікімі творамі антычных аўтараў з розных галін жыцця грамадства: у філасофіі; сацыяльных узаемаадносінах (будаўніцтве рабаўладальніцкай дэмакратыі [20]); мастацтве; навуцы [21] (матэматыцы, медыцыне); архітэктуры і інш. Але самае цікавае, што ў гэты перыяд ужо з'явіліся такія паняцці, як «навучанне», «выхаванне», «школа», «настаўнік» і многае іншае, звязанае з перадачай накопленага сацыяльна значнага досведу новым пакаленням грамадзян. Чаго зусім не ведала (на той час) насельніцтва беларускіх зямель. Як і ўсяго ўсходнеўрапейскага абшару цалкам.

Чым абумоўлена такое адрозненне? Вядома, што беларускія землі ў складзе ўсходнееўрапейскага рэгіёна мелі спецыфіку (адносна Заходняй Еўропы) у сваёй гістарычнай эвалюцыі пад уплывам геаграфічнага і геапалітычнага фактараў. З-за блізкасці да Паўночнага кліматычнага арэала, ахопленага ледавікамі, яны мелі гістарычна-пачатковае засяленне людзьмі ў больш позні перыяд. І, адпаведна, развіваліся са спазненнем.

Кліматычныя ўмовы тэрыторыі Беларусі былі характэрныя плейстацэнам (каля 2,5 млн – 11,7 тыс. гадоў таму) эпохай неаднаразовых абледзяненняў, якія сфарміравалі сучасны рэльеф. Вучоныя вылучаюць некалькі ледніковых эпох (Нараўская, Бярэзінская, Дняпроўская, Сожская, Паазерская), падзеленых міжледнікамі з цяплейшым кліматам. Перыяд палеаліту (ад 100 да 9 тысяч гадоў да н. э.), час з'яўлення найстаражытнейшых людзей на тэрыторыі нашай краіны, як вынікае са спецыяльнай літаратуры, таксама вызначаўся перыядычнымі глабальнымі зніжэннямі тэмпературы навакольнага асяроддзя, «зледзяненнямі», якія працягваліся па некалькі дзесяткаў тысяч гадоў. Паміж зледзяненнямі былі перыяды міжледнікоўяў, калі клімат станавіўся больш прыдатны для жыцця. З'яўленне чалавека ў арэале рассялення сучаснага беларускага насельніцтва адбылося, хутчэй за ўсё, у перыяд Муравінскага міжледнікоўя, якое працягвалася 15 тыс гадоў (з 110 – да 95 тыс гадоў да н. э.). Хаця не выключана, што чалавек прыходзіў на тэрыторыю сучаснай Беларусі і раней.

Яшчэ адной асаблівацю ўсходнееўрапейскага рэгіёна (адпаведна і тэрыторыі Беларусі), у параўнанні з Заходняй Еўропай, з'яўляецца тое, што тут адсутнічала рабаўладальніцкая сацыяльна-эканамічная фармацыя [22]. А менавіта яна (маючы ў аснове сацыяльна-эканамічную базу, створаную бясплатнай працай шматлікай колькасці рабоў) з'яўлялася эканамічнай асновай высокіх дасягненняў культуры антычнасці ў Заходняй Еўропе.

Усё сказанае вышэй з'явілася перадумовай таго, што сярэднявечнае грамадства на тэрыторыі Усходняй Еўропы (і Беларусі) фарміравалася шляхам пераходу ад першабытнасці праз шматукладнасць да феадалізму. «*...[Р]одаплемянное грамадства (на тэрыторыі Беларусі – В.П.) знаходзілася да VII ст. на стадыі ваеннай дэмакратыі. У ім ужо былі зародкі будучай сацыяльнай няроўнасці: грамадскі падзел працы, а таксама патрыярхальнае рабства ўзятых у палон*

*іншапляменнікаў. Гэтыя зародкі атрымалі далейшае развіццё у VII–X стагоддзях...*» [23, с. 2]. А ў IX–XI стст. «*...у грамадстве ўсходніх славян (што пражывалі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне – В.П.) ... суіснавалі тры эканамічныя ўклады: родаплемянны, які быў на схіле, рабаўладальніцкі (ён не атрымаў значнага развіцця) і феадальны, які толькі нараджаўся...*» [24, с. 33].

Заходняя Еўропа на стадыі пераходу ад антычнасці да Сярэднявечча, як заўважана вышэй, ужо валодала значнымі дасягненнямі антычнай культуры. Прычым, што цікава, яна нават стварыла такую структуру, як школа. Ведала пачатковую, сярэднюю і вышэйшую адукацыю як асобныя ступені выхаваўча-адукацыйнага працэсу. У беларускіх землях (як і на астатняй частцы Усходняй Еўропы) у той жа самы час, у галіне выхаваўча-адукацыйнага працэсу (перадачы сацыяльна значнага досведу падрастаючым пакаленням грамадзян), яшчэ ў самым разгары панавала пераходна-ўзроставая ініцыяцыйная абраднасць. І так было ажно да самага пачатку пранікнення хрысціянства і хрысціянізацыі насельніцтва беларускіх зямель. Якое (як вядома) адбылося ў канцы X ст.

Безумоўна, гістарычная эвалюцыя адукацыйна-выхаваўчага працэсу як на Захадзе, так і на Усходзе Еўрапейскага кантынента рухалася ў адным і тым жа кірунку. Яго параметры, як вынікае з гістарычных крыніц, былі вядомыя. Яны выяўляліся ў з’яўленні і станаўленні сістэмы рэлігійна-ідэалагічнай падрыхтоўкі моладзі і поўнага панавання царквы ў галіне перадачы сацыяльна значнага досведу. Але калі ў Заходнееўрапейскім рэгіёне важнейшай адпраўной кропкай станаўлення выхаваўча-адукацыйнага тыпу эпохі Сярэднявечча была антычнасць, з яе высокім узроўнем арганізацыі выхаваўча-адукацыйнай справы, наяўнасцю розных узроўняў адукацыі (пачатковай, сярэдняй, вышэйшай школы), то беларускія землі, як і астатняя частка ўсходнееўрапейскага арэала, пераходзілі да сярэдневяковага спосабу ўзроставай падрыхтоўкі моладзі, ад старажытных (познепершабытных) форм традыцыйнай узроства-ініцыяцыйнай абраднасці (такіх як «лясныя дамы», «язычніцка-жрэчаскае вучнёўства», «дамы-грыдніцы», для элітарных сацыяльных пластоў насельніцтва), да летапісных рэлігійных школ «*вучэння кніжнага*». Інакш кажучы, да канца X ст. на беларускіх землях развівалася створаная яшчэ ў старажытныя часы грамадская традыцыйная ўзроставая ініцыяцыйная абраднасць.

(*Даведка*: **Ініцыяцыя** (*ад лац*.: initiatio – пасвячэнне, здзяйсненне сакрамэнту), абрад пасвячэння, адна з разнавіднасцяў пераходных абрадаў, у выніку якіх індывід … набыва[-е] іншы, як правіла, больш высокі, сацыяльны статус. Ініцыяцыйныя рытуалы садзейнічаюць аваладанню неафітам (тым, каго ініцыіруюць – В.П.) новай сацыяльнай роляй… (у дачыненні да ўзроставых ініцыяцый – роляй дарослага чалавека – В.П.). Мэта ўзроставых ініцыяцый заключаецца ў сацыялізацыі (падлетка – В.П.) …, яго далучэнні да правіл, норм і каштоўнасцяў дадзенага грамадства… [25] (*канец Даведкі*).

Ініцыяцыі былі абавязковымі мерапрыемствамі, якія жорстка кантраляваліся сельскімі познепершабытнымі ўладнымі органамі. Усе падлеткі адпаведнага ўзросту, без выключэння, на працягу пэўнага перыяду часу павінны былі атрымаць неабходныя веды і навыкі падчас так званай перадыніцыяцыйнай падрыхтоўкі.

Гістарычна ранняя ўзроставая пасвячальная абраднасць, як сведчаць этнаграфічныя крыніцы, была напоўнена псіхалагічнымі і фізічнымі, як правіла жорсткімі і пакутлівымі, выпрабаваннямі. Што, апроч выпрацоўкі ўстойлівай кампетэнцыі безумоўнай павагі да існуючых табу, загартоўвала сілу волі кандыдатаў на дарослае жыццё (неафітаў) [26, с. 210–215]. І канешне, дэманстравала іх гатоўнасць вытрымаць любыя складанасці суровых будняў дарослага чалавека. Сярод іх выбіванне (вырыванне) альбо падпілоўванне зубоў; цярпенне парэзаў на целе; хірургічныя аперацыі тыпу абразання; адсяканне пальца; пазбаўленне сну; доўгатэрміновыя забароны на прыём ежы, кровапусканне, укусы атрутных мурашак, душэнне дымам, падвешванне на круках, удары дубінай па галаве, выскубанне валасоў, саскрабанне скуры, выпрабаванне агнём [27, с. 322] і інш. А ўвогуле, «*...самым вядомым элементам ініцыяцый (па меркаванні даследчыка з Каліфарнійскага ўніверсітэта Эдвіна Лоэба – В.П.), з’яўляецца жорсткае збіванне ... неафіт[-аў] ...*» [28, p. 256].

Завяршэнне ўзроства-пасвячальнай абраднасці суправаджалася спецыяльнымі ачышчальнымі працэдурамі (акрапленне крывёй, абмыванне вадой альбо абкурванне благавонным дымам). Але галоўнае, прысваеннем ініцыяванаму (неафіту) нейкіх знакаў

адрознення, што надавалі пэўны прававы статус. Татуіровак альбо спецыфічных парэзаў на целе, нейкіх прэстыжных элементаў адзення [29, с. 80], атрымання неафітам дадатковага імені ці інш. Таго, што назаўсёды замацоўвала ў вачах супляменнікаў яго новае месца ў сацыяльнай іерархіі. Інакш, было доказам яго дарослсці. Давала канчатковы дазвол на ўступленне ў шлюбныя адносіны [30, с. 103] і поўнавартасны ўдзел у жыцці дародавай (ці ранеродавай) грамадскай супольнасці.

Створаная ініцыяцыйная сістэма мела на мэце забяспечыць грамадскі парадак, зняць напружанасць у адносінах паміж узроставымі катэгорыямі і палавымі групамі, асабліва ў моманты іх пераходу да новага сацыяльнага статусу і ўстанаўлення адпаведных сацыяльных сувязей.

З часам яна станавілася больш складанай. З'яўляліся новыя патрабаванні, «этапы», «стадыі». Канчаткова аформленыя (сталыя, класічныя) узроставыя ініцыяцыі, як «абрады пераходу», «*...ажыццяўля[ліся] ў тры этапы: сегрэгацыя – аддзяленне чалавека ад старога асяроддзя, яго разрыў з мінулым; транзіцыя – прамежкавы стан; інкарпарацыя – наступнае ўключэнне індывіда ў сваю сацыяльную групу, але ўжо ў новай якасці і новым статусе...*» [31, с. 92].

Ну і вядома, з павелічэннем колькасці сацыяльных жыццёвых каштоўнасцяў і ростам самаразумення дарослых прадстаўнікоў грамадства, у рытуал узроставых ініцыяцый стаў уключацца «этап авалодвання» навыкамі і ўменнямі. Што значна пашырыла колькасць часу на далучэнне падлеткаў у стан дарослых людзей. І паступова прыняло форму сталай перадыніцыяцыйнай падрыхтоўкі. Якая аддалена нагадвала больш гістарычна пазнейшае навучанне і выхаванне падлеткаў (неафітаў). «*Такое навучанне* – адзначыў вядомы аўстралійскі этнолаг і антраполаг, ганаровы прафесар Сіднейскага ун-та А.П. Элькін – *звычайна доўжыцца год і больш, хоць часам укладваецца ў карацейшы тэрмін*» [32, с. 167].

Завяршэнне навучання, як правіла, афармлялася праходжаннем абрада пасвячэння ў дарослыя ў выглядзе ініцыяцыйна-экзаменацыйных выпрабаванняў моладзі [33, с. 57–66]. Падобная абраднасць, па сведчанні шматлікіх аўтараў, існавала ў розных народаў і на розных кантынентах. Пасвячаемы (неафіт), які «*...праходзі[-ў] сістэму выпрабаванняў і навучання, з пункту гледжання (супляменнікаў – В.П.) станавіўся годным членам грамадства і будучым захавальнікам яго святых міфаў і рытуалаў...*» [34, с. 161].

Перадініцыяцыйная падрыхтоўка ажыццяўлялася ў спецыяльных месцах на значнай аддаленнасці ад месца пастаяннага пражывання падлеткаў. Часцей за ўсё гэта было на тэрыторыі нейкага ляснога масіва. Нездарма значная колькасць даследчыкаў называе гэтую форму навучання моладзі спецыфічнай назвай па тыпу «ляснога» альбо «мужчынскага» дома [35, с. 231–252].

Якія веды паведамлялі падчас перадыніцыяцыйнай падрыхтоўкі? У розных мясцовасцях і на розных стадыях эвалюцыі той ці іншай першабытнай супольнасці яны былі розныя. Як правіла, гэта быў комплекс самых важных ведаў і навыкаў дзеючага грамадства. Калі коратка, то перадыніцыяцыйная падрыхтоўка падлеткаў уключала: а) самазабеспячэнскія («эканамічныя») навыкі; б) агульнапрынятыя правілы сацыяльных (агульнаграмадскіх) паводзін; і, безумоўна, в) міфалагічную спадчыну продкаў ды ідэалагічныя каштоўнасці. Прычым многае «выкладалася» ў форме абрадавых дзеянняў.

(*працяг у наступным нумары*)

## Літаратура

1. Воронцов, Н. Н. Синтетическая теория эволюции: её источники, основные постулаты и нерешенные проблемы / Н. Н. Воронцов // Журн. Весн. хим. об-ва им. Д.И. Менделеева. – 1980. – Т. 25, № 3. – С. 293–312.

2. Пілецкі, В. А. Грамадскае стаўленне да дзяцей і перадумовы ініцыяцыйнай абраднасці – адной з форм выхаваўча-адукацыйнага працэсу эпохі раннядавага ладу / В. А. Пілецкі // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2003. – № 6. – С. 9–14.

3. Пілецкі, В. А. Змест выхаваўча-адукацыйнага працэсу дахрысціянскай Беларусі / В. А. Пілецкі // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2004. – № 3. – С. 3–12.

4. Пілецкі, В. А. Генезіс выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў гісторыі Беларусі / В. А. Пілецкі. – Мінск : БДПУ, 2004. – 237 с.

5. Пілецкі, В. А. Выхаваўча-адукацыйны працэс у гісторыі Беларусі дахрысціянскага перыяду: манаграфія / В. А. Пілецкі. – Мінск : Выд-ва МІК, 2013. – 370 с.

6. Корнетов, Г. Б. Становление воспитания как общественного явления / Г. Б. Корнетов. – М. : Изд-во АПН, 1992. – 103 с.

7. Корнетов, Г. Б. Воспитание в первобытном обществе: возникновение, сущность, эволюция / Г. Б. Корнетов. – М. : Междунар. Пед. Академия, 1993. – 92 с.

8. Хорватова, Э. Традиционные юношеские союзы и инициационные обряды у западных славян / Э. Хорватова // Славянский и балканский фольклор. – М. : Наука, 1989. – 265 с.

9. Косвен, М. О. Очерки истории первобытной культуры / М. О. Косвен. – М., 1953. – 245 с.

10. Файнберг, Л. А. У истоков социогенеза: от стада обезьян к общине древних людей / Л. А. Файнберг. – М. : Наука, 1980. – 146 с.

11. Файнберг, Л. А. Первобытное общество (воспитание) / Л. А. Файнберг // Педагогическая энциклопедия : в 4 т. – М. : Советская энциклопедия, 1966. – Т. 3 : Н–См. – 879 с.

12. Станюкович, М. В. Социализация детей и подростков у ифугао (Филиппины) / М. В. Станюкович // Этнография детства. Традиционные формы воспитания детей и подростков у народов Восточной и Юго-Восточной Азии ; отв. ред И. С. Кон. – М. : Наука, 1983. – 232 с.

13. Eliade, M. Initiation, rite, socétés secrètes: naissances mystigues. Essai sur guelgues tipes d’initiation / M. Eliade. – P., 1958. – 282 p.

14. Becker, R. Die weibliche Initiation im ostslawischen Zaubermarchen. Ein Beitrag zur Funktion und Symbolik des weiblichen Aspektes im Marchen unter Besonderer Btruck sichtigung der Figur der Baba-Jaga / R. Becker. – B., 1990. – 187 s.

15. Анисимов, А. Ф. Духовная жизнь первобытного общества / А. Ф. Анисимов. – Л. : Наука, 1966. – 244 с.

16. Дробушевский, А. И. Городища периода римских влияний на территории Республики Беларусь / А. И. Дробушевский // Лесная и лесостепная зоны Восточной Европы в эпохи римских влияний и Великого переселения народов : конференция 4 ; Ред.: А. М. Воронцова, И. О. Гавритухина. – Тула : Гос. музей-заповедник «Куликово поле», 2015. – Ч. 1. – 311 с.

17. Попов, В. А. Половозрастная стратификация и возрастные классы древнеаканского общества (к постановке проблемы) / В. А. Попов // Советская этнография. – 1981. – № 6. – С. 89.

18. Пілецкі, В. А. «Узроставыя класы» і «ініцыяцыі» як найранейшыя праявы генезісу выхаваўча-адукацыйнага працэсу раннядававага грамадства / В. А. Пілецкі // Весці БДПУ ім. М. Танка. – 2003. – № 3. – С. 126–129.

19. Повесть временных лет / РАН ; подгот. текста, пер., статьи и коммент. Д. С. Лихачева ; под ред. В. П. Адриановой-Перетц. – СПб. : Наука, 2007. – 668 с.

20. Суриков, И. Е. Солнце Эллады: История афинской демократии / И. Е. Суриков. – СПб. : Факультет филологии и искусств СПбГУ, 2008. – 360 с.

21. Волков, М. П. Античная наука как социокультурное явление. Проблема генезиса / М. П. Волков. – Ульяновск : УлГТУ, 2008. – 134 с.

22. Горемыкина, В. И. Возникновение и развитие первой антагонистической формации в средневековой Европе: опыт историко-теоретического исследования на материале варварских королевств Западной Европы и Древней Руси / В. И. Горемыкина. – Минск : Изд. БГУ им. В.И. Ленина, 1982. – 246 с.

23. Штыхаў, Г. В. Гісторыя Беларусі: ад старажытнейшых часоў да канца XIII ст.: вучэб. дапам. для вуч. 10 кл.: у 2-х кн. – Мінск, 1994. – Кн. 1. – 111 с.

24. Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да канца XVIII ст.: вучэб. дапам. для 10 кл. агульнаадукацыйнай школы / Г. В. Штыхаў, П. А. Лойка, І. А. Аўдзееў [і інш.] ; пад рэд. М. С. Сташкевіча. – Мінск : Народная асвета, 2002. – 192 с.

25. Инициация. – URL: https://bigenc.ru/c/initsiatsiia-1ac575 (дата обращения: 21.09.2024).

26. Джолли, А. Значение табу в первобытном обществе / А. Джолли, Ф. Роз // Советская этнография: сб. ст. – М.-Л. : Изд. АН СССР, 1947. – 348 с.

27. Леви-Брюль, Л. Первобытное мышление / Л. Леви-Брюль ; пер. с фр. Б. И. Шаревской. – М. : Академический проект, 2020. – 430 с.

28. Loeb, E. M. Tribal initiations and secret societies / E. M. Loeb. – Los Angeles : University of California, 1929. – 290 p.

29. Геннеп, А., ван Обряды перехода. Систематическое изучение обрядов / А. ван Геннеп ; пер. с франц. – М. : Изд. фирма «Восточная литература» РАН, 1999. – 198 с.

30. Абрамян, Л. А. Первобытный праздник и мифология / Л. А. Абрамян ; Отв. ред. В. В. Иванов. – Ереван : Изд. АН АрмССР, 1983. – 232 с.

31. Тендрякова, М. В. Первобытные возрастные инициации в круге «вечных» вопросов / М. В. Тендрякова // Этнографическое обозрение. – 2014. – № 1. – С. 91–101.

32. Обряд посвящения / А. Элькин // Коренное население Австралии ; пер. с англ. Л. Я. Бровика, В. П. Михайлова ; предисл. и ред. проф. С. А. Токарева. – М. : Иностранная лит-ра, 1952. – 247 с.

33. Балушок, В. Г. Инициации древних славян (Попытка реконструкции) / В. Г. Балушок // Этнографическое обозрение. – 1993. – №4. – С. 57–66.

34. Значение и социальные функции обрядов (обряд посвящения) / А. П. Элькин // Коренное население Австралии ; пер. с англ. Л. Я. Бровика, В.П. Михайлова ; предисл. и ред. проф. С. А. Токарева. – М. : Иностранная лит-ра, 1952. – 248 с.

35. Формы перадачы грамадскага вопыту дзецям у дахрысціянскі перыяд / В. А. Пілецкі // Выхаваўча-адукацыйны працэс у гісторыі Беларусі дахрысціянскага перыяду: манаграфія. – 2-е выд., дапрацаванае. – Мінск : Ковчег, 2017. – 372 с.

Институт истории НАН Беларуси

Поступила в редакцию 14.04.2026